# НАВУКОВАЕ АБГРУНТАВАННЕ ЭКСПАЗІЦЫЙНАГА ПРАЕКТАВАННЯ Ў МУЗЕЯХ

***М. А. Бяспалая,***
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар*

Кожны, хто збіраецца наведаць музей, плануе зрабіць гэта дзеля яго экспазіцыі, за выключэннем невялікай колькасці навукоўцаў, якіх цікавяць перш за ўсё дакументы музейных фондаў. Ад экспазіцыі наведвальнік чакае дасягнення сваёй асабістай мэты: атрымаць эстэтычнае задавальненне, пашырыць веды ў пэўнай галіне, напрыклад, літаратуры, прыродазнаўстве, гісторыі і г.д., прыняць удзел у музейна-педагагічным занятку, што найбольш характэрна для дзіцячых груп. Кожны з нас, успомніўшы апошняе наведванне музея, можа вызначыць, ці змог ён дасягнуць сваёй мэты, якое ўражанне на яго аказала экспазіцыя музея. Гэтыя пытанні (ці адваротная сувязь з наведвальнікам) хвалююць і музейных супрацоўнікаў, аднак выяўленне іх не з’яўляецца нашай задачай.

Прызнанне за музеем статусу сацыякультурнага інстытута выклікана спалучэннем яго шматгранных функцый: спецыфічна музейных – дакументавання, выхавання і інш.; сацыяльных – пашырэнне культурных уплываў у грамадстве, удзел у фарміраванні новых тэндэнцый у культуры і г.д. Разнастайная музейная дзейнасць магчыма пры сукупнасці такіх фактараў, як наяўнасць музейнай калекцыі, прафесійных ведаў і крэатыўнасці супрацоўнікаў. Дзве апошнія з’яўляюцца асабліва важнымі ў ажыццяўленні экспазіцыйнага праектавання.

Для кожнай установы, якая імкнецца называць сябе музеем, самым галоўным відам прэзентацыі яго калекцыі з’яўляецца экспазіцыя. Яе наяўнасць дазваляе даць наведвальніку пэўную інфармацыю, аказаць на яго некаторае эстэтычнае і эмацыянальнае ўздзеянне. Аднак на цяперашні час няма адзінапрынятага вызначэння паняцця музейнай экспазіцыі. Паводле версіі ICOM музейнымі экспазіцыямі могуць лічыцца даступныя для наведвальнікаў археалагічныя аб’екты, заапаркі, дэндрарыі, віварыі, архітэктурныя пабудовы, прэзентацыйныя памяшканні розных навуковых цэнтраў і планетарыяў. Як бачым, у гэтым вызначэнні не канцэнтруецца ўвага на музейнай экспазіцыі. Самая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ранняя дэфініцыя вызначае экспазіцыю як частку музейнага збору, які выстаўлены да агляду. Сучасны падыход пад музейнай экспазіцыяй разумее цэласную прадметна-прасторавую сістэму, у якой музейныя прадметы і іншыя экспазіцыйныя матэрыялы аб'яднаны адзіным канцэптуальным сэнсам.

У савецкай музеязнаўчай навуцы і практыцы доўгі час, да 1970-х гг., абыходзіліся яшчэ без аднаго ключавога паняцця – «навуковая канцэпцыя экспазіцыі». Асноўная ўвага надавалася стварэнню тэматычнай структуры і раскрыццю пэўных тэм. Паступова практыкі і тэарэтыкі музейнай справы прыходзілі да разумення вызначальнай ролі навуковай канцэпцыі, у якой дакладна прапрацаваны найбольш канцэптуальныя пытанні. Гэты працэс быў дастаткова павольным, нягледзячы на тое, што ў некаторых сацыялістычных краінах, напрыклад у ГДР, вылзяляліся нават этапы падрыхтоўкі спачатку першапачатковай, затым пашыранай, а потым ужо дакладнай (канчатковай) навуковай канцэпцыі.

З 2005 г. распачалася праца калектыву пад кіраўніцтвам А. Дэвалье і Ф. Мерэс над музеелагічным слоўнікам, які павінен абагульніць дасягненні музейнай тэорыі. У папярэднім невялічкім выданні будучага слоўніка прыведзены навуковыя пункты гледжання на экспазіцыю музея. Яна разглядаецца як месца, дзе выстаўлены музейныя прадметы; як вынік працэсу экспанавання і адна з галоўных функцый музея; як сукупнасць экспануемых прадметаў.

Прыведзеныя разнапланавыя характарыстыкі экспазіцыі цікавыя для тэарэтыкаў музейнай справы, з практычнага пункту гледжання іх магчыма аб'яднаць, таму што экспанаванне музейных прадметаў з'яўляецца важнейшай музейнай функцыяй, а экспазіцыя – гэта лагічна пабудаваная сукупнасць музейных прадметаў у пэўнай прасторы, якая выконвае інфармацыйную, камунікатыўную, выхаваўчую, эстэтычную і іншыя функцыі.

Паўстае пытанне, з чаго пачаць стварэнне такой цікавай па змесце і прывабнай па форме экспазіцыі? Адказ на гэтае пытанне ў тэарэтыкаў і практыкаў адназначны – з навуковай канцэпцыі. Бясспрэчна, гэта так. У той жа час, каб яе стварыць, неабходна правесці каласальную падрыхтоўчую, перш за ўсё навуковую, работу. Як для пабудовы новага будынка трэба шмат папярэдніх намаганняў: ад вызначэння месца, матэрыялаў да арганізацыйных высілкаў па іх пошуку, транспарціроўцы і г.д., так і з навуковай канцэпцыяй – яе трэба задумаць, абдумаць і абгрунтаваць. Не выпадкова мы ўжо звярталі ўвагу на тое, што галоўнае багацце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музея – навуковы і крэатыўны патэнцыял яго супрацоўнікаў. Менавіта разуменне імі неадпаведнасці існуючай экспазіцыі патрабаванням навукі і часу прыводзіць да высновы аб неабходнасці яе частковай ці поўнай замены.

Тэарэтычнае абгрунтаванне гэтай ідэі трэба шукаць у апошніх даследаваннях профільнай навукі – гістарычнай, філалагічнай, прыродазнаўчай, мастацтвазнаўстве і інш. Навуковыя супрацоўнікі музеяў актыўна выкарыстоўваюць гэты кірунак падрыхтоўкі навуковай канцэпцыі, як і рэгулярныя сустрэчы і кансультацыі з вядучымі навукоўцамі па профілі музея.

Адсутнасць такой работы прыводзіць да адмоўных вынікаў; у якасці прыкладу нагадаем вытрымкі з аднаго дакумента за 1949 г., у якім сказана ў адрас Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны: «Галоўнейшым недахопам навукова-даследчай работы з’яўляецца тое, што яна не праводзіцца па лініі навуковага паглыблення экспазіцыйнай работы музея. У выніку няма матэрыялаў, якія раскрываюць этапы партызанскага руху і ўплыў на яго становішча на фронце, не прапрацавана тэма быту, медабслугоўвання, рэйкавай вайны і г.д.». Дакумент гэты – даведка камісіі па разглядзе экспазіцыі музея – быў падпісаны вядучымі прадстаўнікамі гістарычнай навукі таго часу і выразна адлюстроўваў адсутнасць супрацоўніцтва паміж практыкамі і профільнай навукай.

Стваральнікі новай навуковай канцэпцыі экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ацанілі пасляваенную экспазіцыю як «з асобым натуралізмам» адлюстроўваючую стан грамадства ў гады акупацыі. Наступная экспазіцыя адкрылася ў 1967 г. Яна была пашырана за кошт франтавой тэматыкі і праслаўлення подзвігу савецкага народа, што адпавядала ідэалагічным установкам часоў халоднай вайны і барацьбы за мір.

У 1970–1980-я гг. перад музеем паўстала задача аб перабудове экспазіцый, якія не адпавядаюць дасягненням профільнай навукі, распрацоўкам тэорыі і практыкі музейнай справы. Распрацоўшчыкі навуковай канцэпцыі паставілі перад сабой мэту – улічыць напрацоўкі музейнай псіхалогіі і педагогікі, выкарыстаць магчымасці тагачасных тэхнічных сродкаў. Можна пагадзіцца з думкай многіх наведвальнікаў, што створаная ў гэты перыяд экспазіцыя чатырох залаў, прысвечаных партызанскаму руху, была цікавай, відовішчнай, выразна адрознівалася ад экспазіцый астатніх залаў перш за ўсё мастацкім рашэннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры чарговай перабудове ў 1996–2005 гг. экспазіцыі залаў першага паверха стала магчымым паказаць падзеі вайны больш шматгранна. Былі выкарыстаны матэрыялы, перададзеныя германскім бокам у 1990-я гг., створана выстава «Пралог» і інш. Але згодна ацэнцы аўтараў сучаснай навуковай канцэпцыі ў музеі быў згублены адзіны падыход і стыль падачы матэрыялу. Наспела неабходнасць стварэння новай экспазіцыі, якая б адпавядала сучасным дасягненням ваенна-гістарычнай навукі, музейнай тэорыі і практыкі.

Мы выкарысталі такі дастаткова аб'ёмны прыклад, каб паказаць, з аднаго боку, своеасаблівую «рухомасць» экспазіцыі, якая ні ў адным музеі не застаецца створанай раз і назаўсёды, пастаянна дапаўняецца новымі экспанатамі (рэчавымі і дакументальнымі, уводзяцца адпаведныя тэхнічныя сродкі), а з другога боку, нягледзячы на такія новаўвядзенні, наступае момант, калі экспазіцыя маральна і фізічна старэе і выправіць гэта немагчыма без кардынальнай яе перабудовы. Галоўным падмуркам гэтага працэсу становіцца знаёмства з найноўшымі дасягненнямі профільнай навукі, аб чым было сказана вышэй.

Неабходна прызнаць, што ўся папярэдняя дзейнасць можа застацца толькі «манілаўскімі праджэктамі», калі не будуць улічвацца магчымасці музейных фондаў, калі гэтая дзейнасць не будзе абапірацца на крыніцазнаўчую базу, у якасці якой выступаюць уласныя фондавыя музейныя калекцыі. Некаторыя музеі не расстаюцца са сваімі калекцыямі, у лепшым выпадку могуць пайсці на пагадненне аб дэпазіце, г.зн. часовай перадачы калекцый другому музею. Аднак відавочна, што гэта не выйсце. Таму перад распрацоўшчыкамі навуковай канцэпцыі будучай экспазіцыі стаіць задача спалучыць навуковыя распрацоўкі з магчымасцямі сваіх фондаў.

Бясспрэчна, папоўніць недастаючы матэрыял можна копіямі ці дублікатамі з іншых музеяў, аднак за пошукам неабходных матэрыялаў у іх таксама стаіць працяглая і дакладная навуковая і даследчыцкая праца. Тое ж можна сказаць і аб супрацоўніцтве з архівамі, якія ніколі не расстануцца з арыгінальнымі дакументамі, дазваляючы карыстацца толькі копіямі.

Як сучасны падыход у падрыхтоўчай рабоце па стварэнні навуковай канцэпцыі небходна разглядаць далучэнне да гэтага працэсу сацыялагічных метадаў (апытанне праз анкетаванне наведвальнікаў, музейных спецыялістаў і г.д., інфармацыя аб рабоце над новай экспазіцыяй у сродках масавай інфармацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнае значэнне ў падрыхтоўцы навуковай канцэпцыі экспазіцыі набывае знаёмства з вопытам іншых музеяў, асабліва пры стварэнні навуковых канцэпцый рэгіянальных музеяў, таму што большасць з іх адносяцца да краязнаўчых, а іх экспазіцыі ў пэўнай ступені падобныя. Аднак сказанае ніякім чынам нельга прызнаць як заклік да стварэння адной тыповай канцэпцыі для ўсіх краязнаўчых музеяў. Наадварот, на тое яны і краязнаўчыя, каб адлюстроўваюць спецыфіку свайго краю, а яе якраз і трэба перадаваць праз экспазіцыю рознымі сродкамі музейнай камунікацыі.

Без паглыбленага навуковага вывучэння апошніх дасягненняў профільнай навукі, зместу музейных калекцый, запатрабаванняў наведвальнікаў, вопыту іншых і творчага спалучэння гэтых складнікаў немагчыма стварэнне паўнавартаснай навуковай канцэпцыі, а ў выніку і экспазіцыі, якая б адпавядала сучасным патрабаванням профільнай навукі, тэорыі і практыкі музейнай справы, музейнай педагогікі і сацыялогіі і актыўна садзейнічала музейнай камунікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ